# Школьная планета



Выданне для навучэнцаў і педагогаў ДУА «Дзяніскавіцкі яслі-сад—сярэдняя школа»



## Выпуск №1 (23)

ВЕРАСЕНЬ-КАСТРЫЧНІК 2020

## У школу з добрым сэрцам

У верасні школа зноў кліча вучняў за парты. Дзецям неабходна сабраць рукзак, каб плённа папрацаваць на ўроках. На жаль, не ўсе дзеці маюць такую магчымасць. З мэтай аказання дапамогі дзецям у школе была арганізавана і праведзена дабрачынная акцыя "У школу з добрым сэрцам". Вучні, настаўнікі арганізавалі збор канцылярскіх прылад, цацак, каб дапамагчы дзецям падрыхтавацца да школы. Усе сабраныя рэчы былі перададзены ў школу-інтэрнат. Дзеці з цеплынёй сустрэлі нашых настаўнікаў. Педагог-арганізатар Пан В.В., настаўнікі Кіевіч А.В., Дрозд Н.А., Малявка А.Ф. перадалі ад нашых вучняў і настаўнікаў сабраныя рэчы. Выхаванцы школы-інтэрната падзякавалі гасцям за падарункі.

***Нагорная Дар'я, вучаніца 10 класа***



## Вераснёўскі дзянёк

1 верасня адбылася ўрачыстая лінейка, прысвечаная пачатку навучальнага года. Школа зноў паклікала вучняў за парты. Пачаўся вераснёўскі дзень з сустрэчы з аднакласнікамі, настаўнікамі. Кожны быў рады гэтай сустрэчы. Свята пачалося з урачыстай лінейкі, якую наведалі госці, бацькі. Са словамі прывітання да вучняў, гасцей, бацькоў звярнулася дырэктар установы адукацыі Наталля Іванаўна Берташ. Метадыст раённага вучэбна-метадычнага кабінета Алена Мікалаеўна Муха пажадала ўсім прысутным моцнага здароўя, аптымізму, пазітыўна настроіла вучняў на працу. Старшыня Дзяніскавіцкага сельвыканкама Людміла Міхайлаўна Дубоўская пажадала настаўнікам і вучням плённай працы на ўвесь навучальны год. Пасля святочнай лінейкі вучні і настаўнікі разышліся па кабінетах на першы ўрок. " Я вырас тут, і край мне гэты дарагі", - з такіх слоў кожны настаўнік пачаў першы ўрок у навучальным годзе. У кожным класе настаўнікі паведамілі дзецям аб знакамітых людзях роднай вёскі, аб іх дасягненнях, аб тым, што кожны чалавек, які пакінуў родную вёску, заўсёды з задавальненнем вяртаецца ў бацькоўскую хату, на родны двор.





***Дубоўская Дзіяна, вучаніца 9 класа***

# Нашы таленты

З мэтай развіцця творчых здольнасцей вучняў у школе запланавана правядзенне Тыдня дадатковай адукацыі. На працягу ўсяго тыдня дзеці знаёміліся з аб’яднаннямі па інтарэсах, якія будуць працаваць ва ўстанове на працягу навучальнага года. Рабяты прынялі ўдзел у конкурсе малюнкаў “Мая Беларусь”, які арганізавала педагог дадатковай адукацыі Карпеня Г.І. Кіраўнік аб’яднання па інтарэсах “Інтэлектуальныя гульні” Шахрай Н.М. паведаміла вучням аб правілах інтэлектуальных гульняў, правяла віктырыну. Берташ Н.Г. правяла творчы конкурс “Звонкі галасок”, каб пачуць кожнага жадаючага займацца ў аб’яднанні па інтарэсах “Вясёлыя ноткі”. Асабліва спадабалася вучням экскурсія ў народны гісторыка-краязнаўчы музей. Дзенісеня Т.І. пазнаёміла з гісторыяй стварэння музея, планам работы аб’яднання па інтарэсах “Юны экскурсавод”, якое працуе на базе музея. Гардзей Г.М. правяла з вучнямі майстар-клас “Мае таленты”.



У шосты школьны дзень адбылася прэзентацыя творчых работ вучняў, якія прымалі ўдзел у рабоце аб’яднанняў па інтарэсах на працягу тыдня. Дзеці зрабілі выбар, аддалі перавагу таму аб’яднанню, якое раскрые іх таленты, дапаможа даведацца аб гісторыі роднай вёскі, навучыць ствараць прыгажосць вакол сябе.

***Швайка Вольга, вучаніца 10 класа***

# З павагай да спорту

Фізкультура і спорт з’яўляюцца неад’емнай часткай жыцця чалавека. Кожны імкнецца быць здаровым, дужым, прыгожым. Каб паказаць карысць здаровага ладу жыцця, уплыў заняткаў фізкультурай, у школе быў праведзены тэматычны Тыдзень спорту і здароўя.  У мерапрыемствах удзельнічалі ўсе вучні школы.Класныя кіраўнікі 2-4 класаў правялі з вучнямі рухомыя гульні на свежым паветры. Дзеці гулялі з мячом, правялі спаборніцтвы па скачках праз скакалку. Сярод вучняў 6-11 класаў праведзены турнір па валейболе, піянерболу, футболе. У час гутаркі “Маё здароўе ў маіх руках “ вучні 2-5 класаў пазнаёміліся са складальнікамі здароўя не толькі фізічнага, але і псіхічнага: добры настрой, самаадчуванне і інш.

Удзел вучняў школы ў асеннім легкаатлетычным кросе, які прайшоў ва ўрочышчы Горкі, прынес добрыя вынікі. Вучаніцы 10 класа Завадская Святлана і Швайка Вольга па выніках спаборніцтва занялі два прызавыя месцы.



Добрыя вынікі залежаць не толькі ад самаадчування і фізічнай падрыхтоўкі, але і асабістых адносін да фізкультуры і спорту.

***Яршоў Арцём, вучань 10 класа***

# Коратка аб галоўным

Ва ўстанове прайшоў Тыдзень бяспекі дарожнага руху. Класныя кіраўнікі правялі гутарку “Бяспечная дарога ў школу”, у час якой кожнаму вучню былі раздадзены схемы бяспечнага шляху да школы. У час акцыі “Правілы юнага пешахода і веласіпедыста” вучні падзяліліся ведамі аб тым, як правільна паводзіць сябе на дарозе і пешаходу і веласіпедысту. Вучні 10-11 класаў правялі рэйд па наяўнасці флікераў у вучняў школы. Кожны вучань на працягу тэматычнага тыдня аднавіў у памяці правілы дарожнага руху і абавязкі пешаходаў.

********************

Ва ўстанове адукацыі да  Дня маці прайшоў святочны тыдзень. Вучні 2-11 класаў  арганізавалі і правялі для сваіх матуль мерапрыемствы, акцыі. На працягу тыдня праведзена акцыя “Дзясятка для матулі”, конкурс чытальнікаў вершаў “Матулі прысвячаецца”, кніжная выстава “Матуля мілая мая” і іншыя мерапрыемствы. Кожны вучань напярэдадні свята вырабіў сувенір і падараваў яго матулі.

********************

У школе праведзены выхаваўчыя мерапрыемствы, накіраваныя на прафілактыку супрацьпраўных паводзін. Пачаўся дзень з прававой пяціхвілінкі. Сярод вучняў 2-4 класаў праведзены гутаркі, віктарыны, гульні, накіраваныя на выпрацоўку карысных звычак: гульня “Рэжым дня”, віктарына “Шкодныя і карысныя звычкі”. З вучнямі 5-11 класаў праведзены гутаркі аб адміністратыўнай адказнасці за правапарушэнні.

# ШКОЛА АКТЫЎНАГА ГРАМАДЗЯНІНА

**ШАГ 1 "Мае ўчынкі—мая адказнасць".**

Традыцыйным стала правядзенне адзінай гадзіны інфарміравання "Школа актыўнага грамадзяніна". У верасні ў рамках ШАГ класны кіраўнік 11 класа Швайка Т.У. нагадала вучням аб адказнасці кожнага вучня за свае ўчынкі. У час гутаркі надавалася ўвага вытрымкам з Кодэкса аб адміністратыўных правапарушэннях. Вучні разважалі на тэмы канфліктных сітуацый, маралі, права.



Педагог-псіхолаг Пан В.В. таксама падтрымала размову Яна з рабятамі паразважала на тэму школьных канфліктаў, дапамагла разабрацца ў розных складаных сітуацыях і дала парады, як знайсці выхад з канфліктнай сітуацыі.



Таццяна Уладзіміраўна напрыканцы гутаркі задала пытанне вучням аб тым, ці аказвае ўплыў на ўзаемаадносіны ў класным калектыве педагог-псіхолаг, настаўнікі, сябры, бацькі. Кожны з вучняў выказаў свае меркаванне і прапанаваў шляхі вырашэння канфліктных сітуацый са свайго пункту гледжання.

***Папека Анастасія, вучаніца 10 класа***

**ШАГ 2 "ААН— 75 гадоў: гісторыя дзейнасці,асноўныя дасягненні і ініцыятывы Рэспублікі Беларусь у складзе ААН".**

22 кастрычніка ў школе



праведзены ШАГ 2. Рабяты даведаліся аб гісторыі дзейнасці міжнароднай арганізацыі, якая створана для падтрымання і ўмацавання міжнароднага міру і бяспекі. Рабяты абмеркавалі накірункі дзейнасці ААН, развіццё сяброўскіх адносін паміж краінамі.

Асаблівая ўвага ў час інфармацыйнай гадзіны надавалася абмеркаванню ролі Беларусі ў ААН. Наша краіна не толькі прымала ўдзел у выпрацоўцы дакументаў, але і праводзіла мерапрыемствы па іх вырашэнню. Усім вядомы праект "Зялёная школа", які рэалізуецца ў краіне па ініцыятыве ААН. Таксама Галіна Мікалаеўна Гардзей пазнаёміла рабят з мерапрыемствамі, якія запланаваны ў Беларусі ў юбілейны год ААН,

***Дзенісеня Софія, вучаніца 9 класа***



# Госці ў школе

Напярэдадні канікул нашу школу наведалі класныя кіраўнікі ўстаноў адукацыі раёна. Настаўнікі прынялі ўдзел у раённым вучэбна-метадычным пасяджэнні класных кіраўнікоў. Пасяджэнне прайшло па тэме "Рэалізацыя праектаў выхаваўчай накіраванасці ў класе як адна з умоў павышэння ўзроўню выхаванасці навучэнцаў". Госці на працягу пасяджэння пазнаёміліся з праектам "Нястрачаная спадчына", рэалізацыя якога пачалася ў верасні 2020 года. Цікавымі былі інсцэніраваныя пастаноўкі "Пакровы насталі - поле прыбралі" і "Восеньскі кірмаш", якія паказалі побыт і жыццё нашых бабуль і дзядуль у час святкавання народных свят. Кіраўнік народнага гісторыка-краязнаўчага музея Дзенісеня Т.І разам з удзельнікамі аб'яднання па інтарэсах "Юны экскурсавод" правялі для гасцей пазнавальную экскурсію "Гартаючы мінулага старонкі". Удзельнікі пасяджэння прынялі ўдзел у інтэрактыўным занятку з элементамі трэнінга "Праектаванне з выхаваўчай рабоце". Кожны класны кіраўнік падзяліўся сваімі думкамі, выказаў падзяку за цёплы прыём. Госці з добрым настроеім пакінулі школу.

***Лаўрэнцьева І.П., намеснік дырэктара па асноўнай дзейнасці***



# ТЫДЗЕНЬ ДА ДНЯ НАСТАЎНІКА

Да Дня настаўніка ва ўстанове праходзіў тэматычны тыдзень. На працягу Тыдня былі праведзены выхаваўчыя мерапрыемствы, акцыі, святочныя канцэрты. Вучні 2-11 класаў прынялі ўдзел у гутарцы "Настаўніца першая мая". Вучні выказвалі словы падзякі сваёй першай настаўніцы, успаміналі свае першыя ўрокі. Асабліва ўразіў аповед вучаніцы 10 класа Нагорнай Дар'і, якая з цяплом і павагай расказала пра сваю першую настаўніцу Валянціну Цімафееўну Новік.

Настаўнікі школы, якія працуюць ва ўстанове ўжо шмат гадоў, падзяліліся сваімі поспехамі і перажываннямі за сваіх вучняў. Настаўнікі Лось В.М., Кіевіч А.В., Швайка Т.У., Гардзей Г.М., Карпеня Г.І., Захарчэня Л.Ф., Берташ Н.І., паведамілі вучням аб сваіх педагагічных дынастыях: як працавалі ў школе іх бацькі, як працуюць самі і іх дзеці. Асабліва ўразіў аповед Віктара Міхайлавіча, педагагічная дынастыя якога налічвае больш за 100 гадоў.




Вучні 2-5 класаў прынялі ўдзел у конкурсе малюнкаў "Мой настаўнік". Кожны вучань намаляваў свайго настаўніка, імкнуўся праз малюнак выразіць усю любоў і падзяку. Святочны канцэрт да Дня настаўніка сабраў у актавай зале ўсіх педпгогаў і вучняў. У гонар настаўнікаў нашай школы гучалі песні, вучні чыталі вершы, праводзілі жартоўныя конкурсы. Завяршыўся святочны тыдзень гутаркай "Настаўнік - прафесія на ўсе часы". Вучні падзяліліся думкамі, якімі рысамі характару павінен валодаць настаўнік. напрыканца гутаркі вынік быў адзін - “Настаўнік - прафесія на ўсе часы”.

***Папека Анастасія, вучаніца 10 класа***

## ОЛИМПИАДА ПО ФИНАНСОВОЙ ГРАМОТНОСТИ




Учащиеся нашей школы приняли участие во 2 этапе республиканской олимпиады по финансовой грамотности. Учащаяся 10 класса Попека Анастасия заняла 1 место и была награждена грамотой и ценными призами.

Поздравляем победителя!

**Галуза Вадзім—23.09**
**Нагорная Дар'я—27.09**
**Бондараў Сяргей—21.10**
**Нагорны Захар—14.09**
**Барыскевіч Алеся—27.10**
**Муха Валерыя—12.10**
**Чычко Анастасія—26.10**

**Дзенісеня Софія—08.10**
**Дубоўская Дзіяна—18.10**
**Берташ Руслан—25.10**
**Швайка Вольга—04.10**
**Сукач Вераніка—17.10**




Ганцавіцкі раён
в.Дзяніскавічы
вул. Леніна 93а
Тэлефон: 8 0164651138
Сайт: https://deniskovichi.schools.by
E-mail: deniskovichi@gancevichi.edu.by

«Школьная планета»
Тыраж 4 экзэмпляры
Выданне надрукавана
на прынтэры фармата А4

2020 год

Галоўны рэдактар: Лаўрэнцьева І.П.
Рэдактар: Гардзей Г.М.
Аўтары: школьны прэс-цэнтр
Рэцэнзент: Берташ Н.І.

ДУА «Дзяніскавіцкі
яслі-сад—сярэдняя школа»